# КУРДЗЮКОЎ АЛЯКСЕЙ ЛУКЬЯНАВІЧ.
# 85 ГАДОЎ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

Аляксей Лукьянавіч Курдзюкоў (1928–2006) нарадзіўся ў в. Нежкава Горацкага раёна. Скончыў Беларускую (1951), Маскоўскую (1956) сельскагасакадэміі, аспірантуру БелНДІ земляробства (1965). Працаваў аграномам на Полаччыне (1951–1952), выкладчыкам Глыбоцкага сельскагастэхнікума (1952–1955), навуковым супрацоўнікам, загадчыкам аддзела Магілёўскай абласной вопытнай сельскагаспадарчай станцыі (1956–1969). Кандыдат сельскагаспадарчых навук (1965). Дацэнт (1972). Член геаграфічнага таварыства (1970).

У 1969–1999 гг. А.Л. Курдзюкоў працаваў у Магілеўскім педінстытуце: у 1969–1975 гг. – старшы выкладчык, дацэнт кафедраў краіназнаўства, фізічнай геаграфіі, геаграфіі (чытаў курс біягеаграфіі), в.а. дэкана (1971) геаграфічнага факультэта; у 1975–1977 гг. – прарэктар па завочнаму навучанню Мозырскага педінстытута, у 1977–1987 гг. – прарэктар па завочнаму навучанню МДПІ; у 1988–1999 гг. – дацэнт кафедры педагогікі і методыкі пачатковага навучання педагагічнага факультэта МДУ імя А. Куляшова (заалогія, батаніка, асновы сельскагаспадарчай працы, палявыя практыкі па прыродазнаўству; для студэнтаў біялагічнага факультэта – курс «Біягеаграфія»).

***У.Г. Хамякоў, І.М. Шаруха***

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова